*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**26** ЖНІЎНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 159
(26272)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

## ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ МОЖА ЗМЯНІЦЦА. АДНАК НЕ З НАСТУПНАГА ГОДА

**Калі складаць своеасаблівы «рэйтынг папулярнасці» званкоў на «прамую лінію», то тут па-за канкурэнцыяй аказалася тэма змянення пенсійнага ўзросту. Гэта нагода была далёка не адзінай. Як стане выплачвацца пенсія працуючым пенсіянерам, якімі могуць быць пенсійныя адлічэнні работнікаў з высокай зарплатай, хто павінен збіраць дакументы для афармлення пенсіі і як павялічыць яе памер? Такім чынам, на гэтыя і іншыя пытанні чытачоў «Звязды» адказвае намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА.**



**☎ — *Ці змагу я выйсці на пенсію праз 6 месяцаў, у лютым, калі мне споўніцца 55 гадоў? Ці не павялічыцца да гэтага часу пенсійны ўзрост?***

**Юлія Міхайлаўна ПАЗНЯК,**
*Лоеўскі раён*

*(Аналагічныя пытанні аб магчымым змяненні пенсійнага ўзросту паступілі ад нашых чытачоў з Мінска, Ашмянскага, Рагачоўскага, Валожынскага і іншых раёнаў)*

— Прыкметнае змяншэнне колькасці плацельшчыкаў узносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і значнае павелічэнне колькасці пенсіянераў ужо ў недалёкай будучыні — гэта рэаліі. І, як вынік, рэаліяй самага бліжэйшага часу можа стаць значнае пагаршэнне стану пенсійнай сістэмы. Прычым без пераўтварэнняў ні забяспечыць стабільнасць пенсійных выплат, ні падтрымаць іх памер на больш-менш прымальным узроўні, на жаль, немагчыма. Адным з напрамкаў такіх пераўтварэнняў з'яўляецца якраз змена пенсійнага ўзросту. Па сутнасці гэта непазбежна, і кожны павінен разумець, што раскладка вельмі простая: або выходзіць на пенсію раней і атрымліваць няшмат, або выходзіць пазней і атрымліваць пенсію ў большым памеры. Іншай альтэрнатывы тут няма.

Таму мы перакананыя: павышаць пенсійны ўзрост неабходна, прычым самі варыянты такога павышэння розныя. Існуюць розныя меркаванні і наконт непасрэдна новай «узроставай планкі», і наконт механізма ўвядзення змен (прынамсі, нам хацелася б, каб яны адбываліся не адразу, а паступова), у рэшце рэшт, існуе думка аб магчымасці прадаставіць кожнаму права выбару: афармляць пенсію ў цяперашнім узросце або зрабіць гэта пазней — прычым, натуральна, у другім выпадку сам памер пенсіі павінен быць большым.

Разам з тым трэба адзначыць: пенсійны ўзрост ніколі не павышаецца на працягу аднаго дня. І на сёння ніякіх праектаў на гэты конт намі не рыхтуецца. Словам, пакуль увядзенне новага пенсійнага ўзросту знаходзіцца толькі на ўзроўні прапаноў і меркаванняў.

***(Працяг на 2-й стар.)***

## ШМАТВЯКОВЫЯ ВУЗЫ СЯБРОЎСТВА

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Украіны Віктара Ючшанку з нацыянальным святам — Днём незалежнасці.**

«Шматвяковыя вузы дружбы, якія згуртавалі нашы народы, і сёння з'яўляюцца залогам паспяховага двухбаковага супрацоўніцтва», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею на далейшае ўмацаванне партнёрскіх і добрасуседскіх адносінаў паміж Беларуссю і Украінай.

## Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні

**...Прэзідэнту Ірана**

У сувязі з авіякатастрофай у Бішкеку, у выніку якой загінулі іранскія грамадзяне, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Ісламскай Рэспублікі Іран Махмуду Ахмадзінежаду, а таксама родным і блізкім загінулых.

**...Прэзідэнту Кыргызскай Рэспублікі**

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Кыргызскай Рэспублікі Курманбеку Бакіеву, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку авіякатастрофы ў Бішкеку.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**




*ДП «Минойтовский ремонтный завод» Гродненского УП «Облсельхозтехника»*

**ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ОТКРЫТОМ КОНКУРСЕ**

**по закупке оригинальных рабочих органов и комплектующих плуга к корпусу № 9 «Квернеланд»**

- Отвал п/л 073290R/073291L — 5970/5970 шт.
- Грудь отвала п/л 073256R/073257L — 5970/5970 шт.
- Долото п/л 053090R/063090L — 17910/17910 шт.
- Болт М12х32 — 71640 шт.
- Лемех п/л 073004R/073005L — 11940/11940 шт.
- Болт М14х34 — 95520 шт.

**Срок подачи конкурсных предложений:** с 01.09.2008 г. по 01.10.2008 г. по адресу: 231311 Гродненская обл., Лидский р-н, д. Минойты.

**Справки по телефонам:**
**01561 97 4 16, 2 65 71, 97 1 89.**
**E-mail: minojty rz@tyt.by**

УНП 500052032




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЁСЦЬ МІЛЬЁН НА ВІЦЕБШЧЫНЕ!

**У самай паўночнай Віцебскай вобласці на жніве-2008 намалацілі мільён тон збожжавых пры сярэдняй ураджайнасці пад 34 цэнтнеры з гектара, што больш, чым летась.**

Як мы паведамлялі, сёлета самая вялікая сярэдняя ўраджайнасць — каля 43 цэнтнераў — у Аршанскім раёне, дзе паралельна актыўна рыхтуюцца да правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі».

Камбайнерам Прыдзвінскага краю дапамагаюць калегі з Гомельскай і Брэсцкай абласцей. «Перараэмяркоўваюцца» для хутчэйшага завяршэння ўборкі і механізатары са сваёй вобласці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже, обращенных в доход государства объектов:

| № лота | Объект, общая площадь (кв.м), адрес | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1 | Площадка для сбора мусора, *94,20 кв.м,* (бетонная стяжка, ограждение – железобетон, металлическое), г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 5 708 700 | 10 % |
| 2 | Теплопункт, *101 кв.м*, г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67, корпус № 11 | 21 786 300 | 10 % |
| 3 | Ремстройцех и столярная мастерская, *431,8 кв.м,* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67, корпус № 12 | 70 351 200 | 10 % |
| 4 | Бассейн оборотного водоснабжения, площадь застройки – *464 кв.м,* (материал-железобетон), г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 71 597 700 | 10 % |
| 5 | Склад металла заготовительный резной, корпус № 10, *626,5 кв.м,* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 105 696 000 | 10 % |
| 6 | **1)** Корпус 16 Б, АСУП *(1216,1 кв.м);* **2)** Прессовый участок пластмасс, (пристройка к корпусу № 16 Б), *199,1 кв.м*; **3)** Пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *422,1 кв.м;* **4)** Склад готовой продукции (корпус 16 Б), *397,1 кв.м;* **5)** Два металлических навеса для хранения тары при корпусе 16 Б *(142 кв.м, 119 кв.м);* **6)** Пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *298,2 кв.м.* – расположенные по адресу: г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 603 360 000 | 5 % |
| 7 | Здания столовой (3-этажное, с подвальным помещением и помещением трансформаторной подстанции; стены – кирпичные, панельные, с ж/б колоннами, центр. отопление от ТЭЦ); общ. пл. 5378,2 кв.м; в т.ч. оборудование – трансформатор ТМ 400/10/04; подстанция трансформаторная ТРП – г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 1 948 277 250 | 50 000 000 |

Аукцион состоится **11.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

## МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

| Месца | Краіна | Золата | Серабро | Бронза | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Кітай | 51 | 21 | 28 | 100 |
| 2. | ЗША | 36 | 38 | 36 | 110 |
| 3. | Расія | 23 | 21 | 28 | 72 |
| 4. | Вялікабрытанія | 19 | 13 | 15 | 47 |
| 5. | Германія | 16 | 10 | 15 | 41 |
| 6. | Аўстралія | 14 | 15 | 17 | 46 |
| 7. | Паўднёвая Карэя | 13 | 10 | 8 | 31 |
| 8. | Японія | 9 | 6 | 10 | 25 |
| 9. | Італія | 8 | 10 | 10 | 28 |
| 10. | Францыя | 7 | 16 | 17 | 40 |
| 11. | Украіна | 7 | 5 | 15 | 27 |
| 12. | Нідэрланды | 7 | 5 | 4 | 16 |
| 13. | Ямайка | 6 | 3 | 2 | 11 |
| 14. | Іспанія | 5 | 10 | 3 | 18 |
| 15. | Кенія | 5 | 5 | 4 | 14 |
| **16.** | **БЕЛАРУСЬ** | **4** | **5** | **10** | **19** |
| 17. | Румынія | 4 | 1 | 3 | 8 |
| 18. | Эфіопія | 4 | 1 | 2 | 7 |
| 19. | Канада | 3 | 9 | 6 | 18 |
| 20. | Польшча | 3 | 6 | 1 | 10 |
| 21. | Венгрыя | 3 | 5 | 2 | 10 |
| 22. | Нарвегія | 3 | 5 | 2 | 10 |
| 23. | Бразілія | 3 | 4 | 8 | 15 |
| 24. | Чэхія | 3 | 3 | 0 | 6 |
| 25. | Славакія | 3 | 2 | 1 | 6 |
| 26. | Новая Зеландыя | 3 | 1 | 5 | 9 |
| 27. | Грузія | 3 | 0 | 3 | 6 |
| 28. | Куба | 2 | 11 | 11 | 24 |
| 29. | Казахстан | 2 | 4 | 7 | 13 |
| 30. | Данія | 2 | 2 | 3 | 7 |
| 31. | Манголія | 2 | 2 | 0 | 4 |
| 32. | Тайланд | 2 | 2 | 0 | 4 |
| 33. | Паўночная Карэя | 2 | 1 | 3 | 6 |
| 34. | Аргенціна | 2 | 0 | 4 | 6 |
| 35. | Швейцарыя | 2 | 0 | 4 | 6 |
| 36. | Мексіка | 2 | 0 | 1 | 3 |
| 37. | Турцыя | 1 | 4 | 3 | 8 |
| 38. | Зімбабвэ | 1 | 3 | 0 | 4 |
| 39. | Азербайджан | 1 | 2 | 4 | 7 |
| 40. | Узбекістан | 1 | 2 | 3 | 6 |
| 41. | Славенія | 1 | 2 | 2 | 5 |
| 42. | Балгарыя | 1 | 1 | 3 | 5 |
| 43. | Інданезія | 1 | 1 | 3 | 5 |
| 44. | Фінляндыя | 1 | 1 | 2 | 4 |
| 45. | Латвія | 1 | 1 | 1 | 3 |
| 46. | Бельгія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 47. | Дамініканская рэспубліка | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 48. | Партугалія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 49. | Эстонія | 1 | 1 | 0 | 2 |
| 50. | Індыя | 1 | 0 | 2 | 3 |
| 51. | Іран | 1 | 0 | 1 | 2 |
| 52. | Бахрэйн | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 53. | Камерун | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 54. | Панама | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 55. | Туніс | 1 | 0 | 0 | 1 |
| 56. | Швецыя | 0 | 4 | 1 | 5 |
| 57. | Літва | 0 | 2 | 3 | 5 |
| 58. | Харватыя | 0 | 2 | 3 | 5 |
| 59. | Грэцыя | 0 | 2 | 2 | 4 |
| 60. | Трынідад і Табага | 0 | 2 | 0 | 2 |
| 61. | Нігерыя | 0 | 1 | 3 | 4 |
| 62. | Аўстрыя | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 63. | Ірландыя | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 64. | Сербія | 0 | 1 | 2 | 3 |
| 65. | Алжыр | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 66. | Багамскія астравы | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 67. | Кіргізія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 68. | Калумбія | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 69. | Марока | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 70. | Таджыкістан | 0 | 1 | 1 | 2 |
| 71. | В'етнам | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 72. | Ісландыя | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 73. | Малайзія | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 74. | Сінгапур | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 75. | Судан | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 76. | Чылі | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 77. | Эквадор | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 78. | ПАР | 0 | 1 | 0 | 1 |
| 79. | Арменія | 0 | 0 | 6 | 6 |
| 80. | Тайвань | 0 | 0 | 4 | 4 |
| 81. | Афганістан | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 82. | Венесуэла | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 83. | Егіпет | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 84. | Ізраіль | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 85. | Маўрыкій | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 86. | Малдова | 0 | 0 | 1 | 1 |
| 87. | Тога | 0 | 0 | 1 | 1 |

Алімпіяда-2008. Спецыяльны карэспандэнт перадае з Пекіна

## МЕДАЛЬНЫ ДОЖДЖ АКАЗАЎСЯ НАДЗВЫЧАЙ ПРАЦЯГЛЫМ

**У нядзелю на Нацыянальным стадыёне Пекіна «Птушынае гняздо» ўрачыста быў патушаны алімпійскі агонь XXIX Гульняў. Алімпійская эстафета перададзена Лондану.**

Упершыню за гады самастойнага выступлення на Алімпіядах беларуская каманда змагла дабіцца фенаменальнага выніку, заваяваўшы 19 камплектаў медалёў, з якіх чатыры — залатыя, пяць — сярэбраных і 10 бронзавых.

Цікава, што медальны дождж прыйшоўся на Беларусь пад самы канец Алімпійскіх гульняў. Субота аказалася не такой шчодрай, хоць галоўны трэнер нашых весляроў на байдарках і каноэ Уладзімір Шантаровіч казаў: «Чакайце, нашы павінны яшчэ раз усіх здзівіць». Відавочна, што Уладзімір Уладзіміравіч «перастараўся» ў сваіх прагнозах, бо з трох фінальных заездаў беларусам удалося здабыць толькі адну бронзу. Але калі ўлічыць, што алімпійскія ўзнагароды дасталіся нашай двойцы ў складзе нядаўніх герояў Рамана Петрушэнкі і Вадзіма Махнёва — вынік можна лічыць цудоўным.

У гэты вечар медальны пачын беларускіх весляроў-мужчын падтрымалі дзяўчаты-гімнасткі. Мінчанка Іна Жукава ўпершыню ў гісторыі айчыннай мастацкай гімнастыкі ў асабістым шматбор'і заваявала сярэбраны медаль.

Заключны дзень Алімпійскіх гульняў у Пекіне быў звязаны ў беларусаў толькі з дзвюма дысцыплінамі. Калі марафонец Андрэй Гардзееў з раніцы пасеяў песімізм у душах беларускіх балельшчыкаў, бо 42 км 195 м яму не ўдалося прайсці поўнасцю, то выступленне ў шматбор'і беларускай каманды «мастачак» чакалася з вялікім нецярпеннем. У многім таму, што нашы дзяўчаты цудоўна выступілі на папярэдніх спаборніцтвах, заняўшы там першае месца, і адразу заваявалі судзейскія сімпатыі. Заставалася толькі паставіць на сваім выступленні тлустую кропку. Прыемна, што чаканні беларусаў не аказаліся марнымі. Падначаленыя Ірыны Ляпарскай паказалі свае магчымасці ў поўным аб'ёме і рэальна прэтэндавалі як мінімум на сярэбраныя медалі, следам за расіянкамі. Праўда, пасля першага раздзелу праграмы са скакалкамі беларускам у спіну дыхалі кітаянкі, якіх суддзі «за вушы» цягнулі ў прызёры. На жаль, меркаванні наконт таго, што нашы з гаспадынямі на фінішы могуць памяняцца месцамі, аказаліся прарочымі. Зноў жа не без «добрых» адзнак арбітраў азіяткі з даволі сціплай праграмай па колькасці складаных элементаў, змаглі прасунуцца на другую пазіцыю. Нашы дзяўчаты выступалі перадапошнімі, маючы стратэгічную перавагу над саперніцамі. Аднак па выніках выступлення беларусак ацанілі на «бронзу». Яна з'явілася вянцом на заканчэнні Алімпійскіх гульняў і, без сумненняў, пралогам далейшых поспехаў.

***(Заканчэнне на 4-й стар.)***



*Іна ЖУКАВА.*



*Андрэй КРАЎЧАНКА.*



*Раман ПЕТРУШЭНКА і Вадзім МАХНЁЎ.*

Фотаздымкі БЕЛТА.

Пытанне — адказ

## ПЕРАМОЖАМ РАК

На любыя вашы пытанні, звязаныя з узнікненнем, дыягностыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін рознай лакалізацыі гатовы адказаць галоўны **ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Зігмунд Эдуардавіч ГЕДРЭВІЧ.**

**Пытанні можна пакінуць па нумары 8 (017) 287 18 29.**

*Адказ можна будзе атрымаць непасрэдна праз публікацыю ў газеце «Звязда». Пакідайце свае пытанні да 26 жніўня.*

9 771990 763008 08159>

**УП «Минский городской центр недвижимости»**

**ПРИГЛАШАЕТ К УЧАСТИЮ В АУКЦИОНЕ**

по продаже **трехэтажного кирпичного здания на проспекте Независимости, 58.** Общая площадь – 5 978 кв. м, площадь земельного участка – 0,3179 га. **Аукцион состоится 15 сентября 2008 года.**

**Телефоны для справок:**
**(+37517) 227 48 36, 227 40 22 –**
**Минский городской центр недвижимости.**
**Интернет: www.mgcn.by**

УНП 190398583

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2008 г.***

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 | 1 літоўскі літ | 901,10 |
| 1 еўра | 3 111,51 | 1 расійскі рубель | 86,38 |
| 1 латвійскі лат | 4 424,19 | 1 украінская грыўня | 457,92 |

**Горанский сельский исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Новоселье:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минский р-н, д. Новоселье, 623681315601000306 | 0,1498 га | Инженерные сети электро-, газо-, водоснабжения расположены в пределах 300 м от зем. участков | 13 000 000 | 1 300 000 |
| 2 | Минский р-н, д. Новоселье, 623681315601000307 | 0,1502 га | | 13 000 000 | |

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы в сумме 1 283 142 бел. рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому лоту). Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

*Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды*

**ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ:**

- начальника отдела контроля за использованием вод;
- специалиста отдела контроля за использованием вод.

**ОПЫТ РАБОТЫ ОБЯЗАТЕЛЕН.**

**Тел. для справок и факс для отправки резюме (017) 200 61 90.**

УНП 100519825

# ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ МОЖА ЗМЯНІЦЦА...

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

***☎— Я, як і многія жанчыны ва ўзросце 53—55 гадоў, вельмі занепакоеныя тым, што зусім хутка нас могуць «выштурхнуць» на пенсію. Ці не здаецца вам, што настаў час нарэшце павялічыць пенсійны ўзрост жанчынам, скажам, да 60 гадоў?***

**Таццяна Генадзьеўна Якавенка, г. Рагачоў**

— Пытанне, Таццяна Генадзьеўна, добрае. Вы маеце рацыю: «выштурхванне» жанчын у 55 гадоў на пенсію няправільнае. У такім узросце жанчыны, як правіла, яшчэ застаюцца энергічнымі, маюць сілы і жаданне працаваць. А значыць, яны павінны мець права атрымліваць параўнальна больш важкую, чым пенсія, крыніцу даходу — зарплату.

Вядома, што стан здароўя кожнага з нас розны, але той факт, што беларускі пенсіянер працягвае працаваць яшчэ ў сярэднім пяць гадоў пасля прызначэння пенсіі, сведчыць аб тым, што фактычна людзі выходзяць на пенсію ў працаздольным узросце. Хоць па сваёй сутнасці пенсія — гэта замена страчанага заробку ў сувязі з непрацаздольнасцю. Таму я не хаваю, што мне вельмі хацелася б, каб нашы прапановы па змяненні пенсійнага ўзросту (а рыхтаваць іх мы будзем у наступным годзе) былі пачутыя, падтрыманыя і каб іх успрынялі з разуменнем. Бо зноў-такі: выходзіць на пенсію рана і разлічваць на яе высокі памер надалей немагчыма.

***☎— Час ад час у нас друкуюцца звесткі аб колькасці пенсіянераў, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, і робяцца каментарыі, што памеры пенсій такім людзям нашмат перавышаюць сумы страхавых адлічэнняў. Аднак чаму няма ніякай статыстыкі аб колькасці асобаў, якія таксама плацяць сацстрах, але не дажываюць да пенсіі? І ці не здаецца вам, што адлічэнні тых, хто памірае маладым, з лішкам кампенсуюць «пераплаты» 80-гадовым?***

***І па-другое. Паводле статыстыкі, дзяржслужачыя, міліцыянеры і падаткавікі атрымліваюць пенсію ў сярэднім 10 гадоў. Аднак не сакрэт: пры гэтым памер іх пенсій перавышае пенсіі працоўныя амаль удвая. У выніку ж сума выплат дзяржслужачым і «сілавікам» за 10 гадоў атрымліваецца амаль такой жа, як працоўным пенсіянерам за 20 гадоў. Адкуль такія прывілеі?***

**Вера Барысаўна,** *Рагачоўскі раён*

— Статыстыка, колькі людзей памірае ў тым або іншым узросце, ёсць. Гэта статыстыка не сакрэтная, як не з'яўляецца сакрэтам і тое, што хтосьці памірае ў 20 ці 30, а хтосьці — і ў 100 гадоў. Прычым па вялікім рахунку такая статыстыка ніяк не звязаная з пенсійным узростам, бо пагадзіцеся: для чалавека, які памірае ў 40 гадоў, занадта высокай з'яўляецца і 41-гадовая «ўзроставая планка». Да таго ж тут ёсць і іншы бок медаля. Страчаных у маладым узросце плацельшчыкаў страхавых узносаў пенсійнай сістэме ніхто і нішто не кампенсуе. Больш за тое, такая страта для сістэмы абарочваецца дадатковымі выдаткамі ў выглядзе дапамогі на пахаванне і часта — на пенсію па страце карміцеля. У нас, як і ў большасці краін, выплаты пенсіянерам фінансуюцца з бягучых страхавых узносаў працуючай часткі насельніцтва. І, відавочна, што змяншэнне колькасці працаздольнага насельніцтва можа пацягнуць за сабой змяншэнне аб'ёму сабраных сродкаў, што, адпаведна, зніжае магчымасці для павышэння пенсій, і ў тым ліку — асобам ва ўзросце больш за 80 гадоў. Дарэчы, што да пенсійнага забеспячэння 80-гадовых грамадзян, то нагадаю: да іх пенсіі прадугледжана надбаўка на догляд.

Паралельна хацелася б адзначыць: чамусьці папулярныя сцвярджэнні, нібыта грамадзяне Беларусі не дажываюць да пенсіі, на справе не маюць пад сабой ніякіх падстаў. У такім выпадку ў краіне проста не магло б быць 2,5 мільёна пенсіянераў. Прычым больш за 2 мільёны з іх — гэта пенсіянеры, якія дажылі і, дзякуй богу, жывуць на пенсію.

І па другім пытанні. Варта заўважыць: размовы аб астранамічных памерах пенсій тых жа дзяржслужачых — чарговы міф. Так, пенсіі асобных дзяржслужачых, якія ў свой час займалі высокія пасады, сапраўды адносна высокія. Аднак пенсія асноўнай часткі дзяржслужачых атрымліваецца большай за іх працоўную пенсію ўсяго на 20—30 тысяч рублёў — і тое ў лепшым выпадку. Пры гэтым працягласць атрымання пенсій дзяржслужачымі сапраўды меншая.

Што ж да ваеннаслужачых, міліцыі і іншых сілавікоў, то яны маюць асобную пенсійную сістэму. Прычым падобныя асобныя сістэмы ёсць у кожнай дзяржаве, што абумоўлена спецыфікай службы гэтых людзей. Бо сцвярджаць, што іх служба з'яўляецца лёгкім заняткам зноў-такі недарэчна, фактычна гэта служба ідзе днём і ноччу, прычым часта — у экстрэмальных умовах. Увогуле, што датычыцца пенсійнага забеспячэння ўзгаданай катэгорыі, то гэта — кампетэнцыя адпаведных «сілавых» ведамстваў. Адно, што тут я магу выказаць асабістае меркаванне: выплата пенсій сілавікам у перыяд работы павінна рабіцца з абмежаваннямі — гэтаксама, як і грамадзянскім асобам.

***☎— Ці будуць плаціць пенсію з улікам каэфіцыента больш за 4,0 пасля магчымага змянення пенсійнага заканадаўства? Да прыкладу, у свой час я меў добрую зарплату, з яе рабіліся вялікія адлічэнні на сацыяльнае страхаванне, аднак цяпер пенсію плацяць з абмежаваннямі.***

**Мікалай Аляксандравіч Літвінскі,** *Любанскі раён*

— У рамках сацыяльнага страхавання не выкарыстоўваецца прынцып эквівалентнасці пенсійных выплат адлічаным узносам. Дзяржава прымае на сябе абавязак па забеспячэнні толькі неабходных сацыяльных гарантый. Пры гэтым можа ўстанаўлівацца пэўная залежнасць памеру пенсіі ад фінансавага ўкладу работніка. І ступень гэтай залежнасці вызначаецца аб'ёмам пенсійных сродкаў.

Наша пенсійная формула звязвае памер пенсіі з заробкам і працоўным стажам. Для больш шчыльнай звязкі пенсіі з высокімі заробкамі ў мінулым патрэбныя дадатковыя сродкі, якіх, на жаль, няма. Між тым, у будучыні сапраўды плануецца паступова пераходзіць да вылічэння пенсіі зыходзячы з аб'ёму ўзносаў, якія выплачваліся работнікам на пенсійнае страхаванне.

Што ж да бліжэйшай перспектывы, то мы выходзім з прапановай: не браць узносы на пенсійнае страхаванне з заробку больш чым 4 зарплаты па краіне.

***☎— Ходзяць чуткі, што ў хуткім часе супрацоўнікам органаў па надзвычайных здарэннях для выхаду на пенсію па выслузе спатрэбіцца не 20, а ўжо 25 гадоў спецыяльнага стажу. Ці так гэта?***

**Сяргей Міхайлавіч,** *Лагойскі раён*

— Паколькі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пытанні «неграмадзянсіх» пенсій не вядзе, адказаць што-небудзь канкрэтнае на гэты конт мне цяжка. Таму, Сяргей Міхайлавіч, паспрабуйце звярнуцца ў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

***☎— Атрымалася так, што з 6 чэрвеня па 26 кастрычніка 1986 года майго мужа прызвалі на ваенныя зборы для ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Аб гэтым ёсць адзнака ў ваенным білеце, ёсць даведка з архіва Міністэрства абароны. Разам з тым залічыць работу ў чарнобыльскай зоне ў стаж як ліквідатару мужу адмаўляюць. Што рабіць у такой сітуацыі?***

**Тамара Іванаўна,** *г. Мінск*

— Паводле нашага заканадаўства, работа ці служба па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на самой станцыі і ў зоне эвакуацыі (адчужэння) да 31 снежня 1987 года залічваецца ў стаж у 3-разовым памеры, а з 1 студзеня 1988 года — у памеры паўтара раза. Таму ў дадзеным выпадку сапраўды патрэбна даведка: у якіх канкрэтна населеных пунктах, у якой зоне дыслакавалася вайсковая часць. На жаль, у даведцы, якую выдаў архіў, такіх звестак няма — словам, трэба шукаць іншыя дакументы.

***☎— Я пенсіянерка, але працягваю працаваць у школе вартаўніком. Зарплата ў лепшым выпадку з усімі прэміямі — каля 200 тысяч. Пры гэтым, паколькі індывідуальны каэфіцыент складае 1,98, робіцца вылік 60 тысяч з маёй пенсіі. Магчыма, так насамрэч трэба. Аднак у мяне прапанова: рабіць вылікі не ўсім працуючым пенсіянерам, а толькі тым, хто зарабляе шмат — скажам, па мільёну. Або, як варыянт, ці не лепш прадугледзець нейкую шкалу вылікаў — зноў-такі ў залежнасці ад зарплаты працуючага пенсіянера?***

**Галіна Васільеўна Дрык,** *г. Мінск*

— Дзякуй за пытанне. Як вядома, цяпер у працуючых пенсіянераў прымаецца пад увагу толькі індывідуальны каэфіцыент да 1,3. І, на наш погляд, сённяшні парадак выплаты пенсіі падчас работы з улікам мінулага заробку (таго ж індывідуальнага каэфіцыента) насамрэч не зусім справядлівы. Таму ў будучыні ёсць намер прапанаваць іншы падыход — «прывязаць» выплату пенсіі працуючым пенсіянерам да іх бягучага заробку. Інакш кажучы, абмяжоўваць выплату пенсій у залежнасці ад узроўню іх цяперашняй зарплаты.

Прычым работа ў гэтым напрамку ўжо вядзецца. Праўда, сцвярджаць, што новаўвядзенне запрацуе літаральна заўтра, я не стала б — працэс унясення змяненняў у законы заўсёды вельмі працяглы.

***☎— Турбуюць вас з Турава, завуць мяне Лідзія Васільеўна. А пытанне такое: хто павінен збіраць неабходныя для афармлення пенсіі дакументы?***

— Закон «Аб пенсійным забеспячэнні» вызначае, што збіраць дакументы і рабіць запыты неабходных звестак мусіць работадаўца, у прыватнасці, кадравік ці які-небудзь іншы супрацоўнік арганізацыі, на якога гэтыя абавязкі ўскладзены спецыяльным загадам. Прычым падрыхтоўка дакументаў павінна пачынацца загадзя — як мінімум за год да дасягнення работнікам пенсійнага ўзросту.

***☎— Летась прызначылі III групу інваліднасці і далі медыцынскія рэкамендацыі — перавод на лёгкую работу. Але, нягледзячы на звароты ў службу занятасці, такую работу я знайсці не магу. Жыву з жонкай-інвалідам I групы, мая пенсія — усяго 185 тысяч. Як на яе пражыць?***

***І яшчэ. Ці магу я, як інвалід, выйсці на пенсію раней па стане здароўя?***

**Чэслаў Уладзіміравіч Жынгель,** *Глыбоцкі раён*

— Пры вызначэнні III групы інваліднасці маецца на ўвазе, што ў чалавека захоўваецца працаздольнасць і магчымасць працаваць. У сувязі з гэтым памер пенсіі па інваліднасці III групы не можа быць высокім — такая пенсія павінна замясціць страту толькі часткі зарплаты ў сувязі зноў-такі з частковай стратай працаздольнасці. Таму, Чэслаў Уладзіміравіч, для вырашэння матэрыяльных праблем спрабуйце ўсё ж уладкавацца. Дарэчы, як нам удалося высветліць у дырэктара мясцовага СВК «Мацюкова», вакансіі, што адпавядаюць вызначаным вам працоўным рэкамендацыям, у гаспадарцы ёсць.

Што ж да выхаду на працоўную пенсію раней за агульнаўсталяваны ўзрост па стане здароўя, то такой магчымасці наша заканадаўства не прадугледжвае. З-за дрэннага здароўя прызначаецца пенсія па інваліднасці.

***☎— Пасля прызначэння II групы інваліднасці майму мужу прапанавалі перайсці на палову стаўкі. Як гэта адаб'ецца на памеры яго пенсіі?***

**Вольга,** *Ляхавіцкі раён*

— Інваліду II групы, які працягвае працаваць, пры пераходзе на пенсію па ўзросце ў будучыні гэта пенсія можа быць вылічана з таго ж заробку, што і пенсія па інваліднасці. Інакш кажучы, час работы на палову стаўкі можа ўвогуле не прымацца ў разлік.

**Сяргей ГРЫБ.**

**(Працяг будзе).**

# СТАЦЬ НАВАСЁЛАМ




***Мы жывём у вёсцы. З нараджэннем трэцяга дзіцяці нашы жыллёвыя ўмовы змяніліся. На рабоце мужу раяць станавіцца на жыллёвы ўлік, магчыма, хутка будуць у вёсцы будаваць новыя дамы. Але нам з мужам хацелася б пабудавацца ў райцэнтры. Даход у нас невялікі, ёсць надзея атрымаць ільготны крэдыт. Ці можна стаць на жыллёвы ўлік у райцэнтры?***

**Ганна К.,** *Брэсцкая вобласць*

Згодна з пунктам 7 Палажэння, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў» са змяненнямі і дапаўненнямі, улік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ажыццяўляецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па іх пастаянным месцы жыхарства. Тым не менш, пастаноўка на ўлік па пастаянным месцы жыхарства не перашкодзіць вам пабудаваць кватэру ў раённым цэнтры. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10.07.2008 г. № 382 унесены змяненні і дапаўненні ва Указ ад 14.04.2000 № 185 «Аб прадастаўленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў», у адпаведнасці з якімі грамадзяне, што пражываюць у сельскіх населеных пунктах, пасёлках гарадскога тыпу, гарадах раённага падпарадкавання і стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па іх пастаянным месцы жыхарства, пры жаданні пабудаваць або набыць жылое памяшканне ў іншых населеных пунктах у межах адпаведнага раёна, уключаюцца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў раённымі выканаўчымі і распарадчымі органамі з захаваннем чарговасці.

Шматдзетныя сем'і, як устаноўлена падпунктам 1.10 Указа ад 14.04.2000 г. № 185, уключаюцца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў у пазачарговым парадку і, згодна з падпунктам 1.11, маюць права на сумеснае выкарыстанне льготнага крэдыту і аднаразовай бязвыплатнай субсідыі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

Пунктам 4[1] Указа устаноўлена, што раённыя, гарадскія, раённыя ў гарадах выканаўчыя і распарадчыя органы павінны забяспечыць вядзенне асобных спісаў шматдзетных сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на пазачарговае атрыманне льготных крэдытаў і аднаразовых бязвыплатных субсідый.

Выканаўчыя і распарадчыя органы павінны таксама ў трохмесячны тэрмін з дня падачы шматдзетнымі сем'ямі заявы з неабходнымі дакументамі забяспечваць уключэнне іх у арганізацыі забудоўшчыкаў (долевае будаўніцтва) або ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў для рэканструкцыі або набыцця жылых памяшканняў (у тым ліку на другасным рынку жылля) у мэтах гарантаванага прадастаўлення жылля на працягу года.

Сумесна з ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» выканаўчыя і распарадчыя органы павінны забяспечваць своечасовае выдзяленне аднаразовых бязвыплатных субсідый і льготных крэдытаў шматдзетным сем'ям, якія маюць права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў.

Права палепшыць свае жыллёвыя ўмовы з выкарыстаннем льготнага крэдыту не па месцы пастаяннага жыхарства прадастаўлена не толькі сельскім жыхарам, але і жыхарам абласных цэнтраў і горада Мінска. Так, згодна з Указам, грамадзяне, якія пражываюць у гарадах абласнога падпарадкавання і ў горадзе Мінску і стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па іх пастаянным месцы жыхарства, па іх заяве могуць уключацца ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў шляхам будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця аднакватэрных або блакіраваных жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах.

«Звяздоўцы» сардэчна віншуюць былую супрацоўніцу **Святлану Міхайлаўну МАРОЗАВУ** з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, заўсёднага добрага настрою, шчасця і ўдачы!

**В извещении о проведении открытого аукциона**

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, опубликованном в газете «Звязда» от 07.08.2008 г., **по лоту № 2 вместо «Ручьи-1982» читать «Родник-1».**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАРЛАМЕНТ РФ ПРЫЗНАЎ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ І АБХАЗІІ

**Савет Федэрацыі і Дзярждума Расіі ў панядзелак аднагалосна прагаласавалі за незалежнасць для Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Прашэнне разгледзець гэтае пытанне будзе накіравана ад імя абедзвюх палат прэзідэнту РФ.**

Першымі з каментарыямі выступілі прэзідэнты пакуль яшчэ непрызнаных рэспублік. Сяргей Багапш заявіў, што прызнанне незалежнасці будзе спрыяць стабільнасці ў рэгіёне. А Эдуард Какойты паведаміў, што яны не будуць фарсіраваць падзеі і пачакаюць афіцыйнага прызнання — за подпісам Мядзведзева.

«Прызнанне Расіяй незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі — гэтая неабходная ўмова забеспячэння бяспекі гэтых народаў — адзначыў на пасяджэнні спікер Сяргей Міронаў. — Мы абавязаныя падтрымаць імкненне народаў Паўднёвай Асеціі і Абхазіі да стабільнасці, міру і незалежнасці».

Нагадаем, у мінулы чацвер у Абхазіі і Паўднёвай Асеціі прайшлі народныя сходы, на якіх былі прынятыя звароты да кіраўніцтва Расіі з просьбай прызнаць незалежнасць гэтых рэспублік.

### СААКАШВІЛІ: АДНАВІЎШЫ БАЯЗДОЛЬНАСЦЬ З ДАПАМОГАЙ ЗША, ГРУЗІЯ ДАБ'ЕЦЦА КАНТРОЛЮ НАД ПА І АБХАЗІЯЙ

**Грузія «стаіць на сваім» і даб'ецца ўсталявання поўнага кантролю над Паўднёвай Асеціяй і Абхазіяй. Аб рашучасці Тбілісі ў гэтым пытанні заявіў грузінскі прэзідэнт Міхаіл Саакашвілі ў інтэрв'ю амерыканскай газеце International Herald Tribune, якая выходзіць у ЕС.**



Пры гэтым ён адзначыў, што дадзеная задача «з'яўляецца пастаяннай». Саакашвілі падкрэсліў, што Грузія цалкам адновіць сваю баяздольнасць. Ён таксама паведаміў, што адміністрацыя ЗША «не выказвала сваёй незадаволенасці» дзеяннямі Тбілісі, калі ў ноч на 7 жніўня быў аддадзены загад атакаваць Цхінвалі. Акрамя таго, прэзідэнт адзначыў, што Вашынгтон «не падае сігналаў» аб скарачэнні аб'ёмаў сваёй дапамогі Грузіі.

Саакашвілі заявіў, што цяпер па меншай меры двойчы ў суткі праводзіць тэлефонныя перамовы з фактычным кандыдатам у прэзідэнты ад Рэспубліканскай партыі Джонам Макейнам.

### УЛАДЫ КІРГІЗІІ ВЫКЛЮЧЫЛІ ВЕРСІЮ ТЭРАКТА Ў КАТАСТРОФЕ «БОІНГА»

**Прычынай падзення самалёта Boeing-737 у Бішкеку не быў тэрарыстычны акт, перадае агенцтва «Інтэрфакс» са спасылкай на заяву міністра транспарту і камунікацый Кіргізіі Нурлана Сулайманава.**



Паводле слоў міністра па надзвычайных сітуацыях Камчыбека Ташыева, прычыны катастрофы будуць названыя пасля даследавання «чорных скрыняў» і расшыфроўкі перамоваў паміж экіпажам і дыспетчарам. Самапісцы былі знойдзеныя на месцы катастрофы, яны перададзеныя ў Генеральную пракуратуру Кіргізіі, а пасля адмысловых працэдур іх адправяць у Маскву на расшыфроўку.

«Боінг» кіргізскай авіякампаніі Itek Air здзяйсняў рэйс Бішкек — Тэгеран. На борце самалёта знаходзіліся 90 чалавек, у асноўным, замежныя грамадзяне. У выніку катастрофы загінулі 68 чалавек. Яшчэ некалькі чалавек знаходзяцца ў цяжкім стане. Таксама выратавальнікі мяркуюць, што некалькі чалавек у стане шоку маглі самастойна пакінуць месца падзення самалёта.

## ВІЗІТ ПАТРЫЯРХА МАСКОЎСКАГА І ЎСЯЕ РУСІ АЛЯКСІЯ ІІ У МІНСК АДБУДЗЕЦЦА 22—23 КАСТРЫЧНІКА

Аб гэтым паведаміў рэдактар Выдавецтва Беларускага экзархата Віктар Папоў. Паводле яго слоў, Патрыярх прыме ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных святкаванню 1020-годдзя хрышчэння Русі. З удзелам кіраўніка Рускай праваслаўнай царквы будзе арганізаваны круглы стол, прысвечаны пытанням адраджэння ў грамадстве праваслаўнай веры, маралі і культуры.

**БЕЛТА.**

## Абзац

■ У выніку ДТЗ у Нясвіжскім раёне загінулі вадзіцель і пасажыр, яшчэ адзін пасажыр памёр у бальніцы. Вадзіцель «Рэно» пры выездзе на галоўную дарогу не прапусціла аўтамабіль «Пежо», у выніку чаго загінула сама і двое пасажыраў, у тым ліку яе маці. За мінулую нядзелю ў краіне загінулі ў ДТЗ 8 чалавек, 242 вадзіцелі затрыманы ў нецвярозым стане.

**■ Міліцыя шукае зламыснікаў, якія праз выбітае акно залезлі ў катэдж у Раўбічах і вынеслі $20 тыс, Br25 млн і ключы ад аўтамабіля «Аўдзі-80».**

■ Безгаспадарныя будынкі і надворныя пабудовы згарэлі ў вёсцы Хомінка Лоеўскага раёна ў выніку выпальвання сухой травы. Траву выпальвала мясцовая жыхарка 1931 года нараджэння, у выніку згарэла 4 будынкі і 9 надворных пабудоў.

**■ Пракуратура Драгічынскага раёна праводзіць праверку па факце гібелі 7-гадовага школьніка на тэрыторыі закрытага на капітальны рамонт дзіцячага садка. На хлопчыка ўпала металічная канструкцыя, ад атрыманых траўмаў ён памёр. Тэрыторыя садка агароджаная парканам вышынёй 1,2 м, усе веснічкі закрытыя на замкі, аднак дзеці пранікалі на тэрыторыю і гулялі там. Праводзіцца праверка.**

■ Цэнтральная выбарчая камісія Азербайджана зарэгістравала яшчэ двух асобаў, якія хочуць стаць кандыдатамі на пасаду прэзідэнта краіны на выбарах, што адбудуцца ў кастрычніку. Агульны лік прэтэндэнтаў склаў 18 чалавек.

**■ У выніку пажару, што адбыўся ў адным з рэстаранаў у цэнтры Кіева, зажыва згарэлі чатыры чалавекі, 8 пацярпелых з апёкамі рознай ступені шпіталізаваныя. На працягу гадзіны 5 падраздзяленняў пажарнай аховы змагаліся з агнём. Паводле папярэдніх дадзеных, прычынай пажару стаў падпал. Узбуджана крымінальная справа.**

■ У суботу ў райцэнтры Голая Прыстань у Херсонскай вобласці адкрылі помнік кавуну — ягадзе, што праслявіла Херсоншчыну далёка за яе межамі. Адкрыццё помніка адбылося ў рамках раённага фестывалю «Салодкі цуд», што праводзіцца ў Голай Прыстані ў шосты раз. Памер голапрыстаньскага кавуна ўражвае: яго вышыня — 1 м 75 см, а шырыня — 1 м 20 см.



## Поўны абзац

■ Падушку, якая здольная падчас сну разгладжваць зморшчыны твару, вынайшлі ізраільскія вучоныя. Сакрэт заключаецца ў тым, што ў тканіну падушкі ўплецены вельмі тонкі медны дрот. Даследаванні паказалі, што пасля чатырох тыдняў карыстання такой падушкай на твары чалавека адбываецца разгладжванне зморшчынаў, пры гэтым адчуванні чалавека пры дотыку да тканіны такія ж, як звычайна. У бліжэйшы час падушка паступіць у продаж у Еўропе.

**■ Сучка, у якой былі шчанюкі, выратавала ад смерці нованароджаную дзяўчынку ў аргенцінскім горадзе Абаста, што непадалёк ад Буэнас-Айрэса. Гаспадар жывёліны пазваніў у паліцыю і паведаміў, што сучка выявіла на вуліцы дзяўчынку, што нарадзілася некалькі гадзін таму і, у адпаведнасці з мацярынскім інстынктам, прынесла яе ў дом, дзе паклала побач са сваімі шчанюкамі. Дзіця было абсалютна голае, яно магло памерці ад пераахалоджвання. Дзяўчынку тэрмінова даставілі ў шпіталь, дзе ўрачы пасля абследавання запэўнілі, што ёй нічога не пагражае. Удалося знайсці і маці выратаванай дзяўчынкі. Ёй аказалася 14-гадовая мясцовая жыхарка. Вядзецца праверка па высвятленні ўсіх абставінаў.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

### ВЫЙШЛА ЖЫВЁЛА НА ЧЫГУНКУ

24 каровы збіў пасажырскі цягнік Сімферопаль — Мінск у раёне Чырвонага Берага, што ў Жлобінскім раёне. Статак выйшаў на чыгуначныя пуці, прарваўшы электраагароджу. Машыніст, як паведаміў нам кіраўнік прэс-цэнтра гомельскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Руслан Габрылёў, нягледзячы на прынятыя меры, не змог прадухіліць наезд на жывёлу.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# БЕЛАРУСКАЯ ТУРЫСТКА ПАМЕРЛА Ў КАІРЫ

**Беларуская турыстка, якая пацярпела ў выніку аварыі аўтобуса ў Егіпце, памерла ўчора ў каірскім шпіталі, паведаміў прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў.**

Рэанімацыйныя працэдуры, паводле слоў егіпецкіх медыкаў, станоўчага выніку не далі. 24 жніўня аўтобус з 25 турыстамі з Расіі, Украіны, Беларусі і Венгрыі, якія адпачывалі на курортах Табы і Нувейбы Сінайскага паўвострава, накіроўваўся на экскурсію ў егіпецкую сталіцу. Паводле папярэдніх даных, аўтобус за 70 км ад Каіра пры абгоне машыны, што ішла наперадзе, на вялікай скорасці зачапіў аўтамабіль, які рухаўся ў гэтым жа напрамку. У выніку сутыкнення загінуў егіпецкі супрацоўнік сілавых структур, які суправаджаў турыстаў. Яшчэ адна беларуска ў выніку ДТЗ атрымала нязначныя пашкоджанні, цяпер яна знаходзіцца ў гасцініцы ў Каіры.

Цяпер консульскі супрацоўнік пасольства Беларусі ў Егіпце і муж загінулай, які быў разам з ёю ў аўтобусе ў час аварыі, знаходзяцца ў шпіталі, дзе сумесна з прадстаўнікамі страхавой і турыстычнай кампаній вырашаюць пытанні афармлення неабходных дакументаў аб смерці, а таксама адпраўкі цела загінулай у Беларусь.

Дзяржкантроль у дзеянні

# ПАДШКЛЯНАК ДЛЯ АХОЎНІКА

**Дзяржкантроль праверыў 70 арганізацый Беларускай чыгункі і практычна ў кожнай знайшоў парушэнні.**

22 жніўня ў Камітэце дзяржкантролю адбылося пасяджэнне калегіі, прысвечанае вынікам праверкі асобных пытанняў фінансава-гаспадарчай дзейнасці дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка». Адна з галоўных высноў: многія парушэнні аналагічныя альбо тыя ж самыя, што былі выяўлены і чатыры гады таму. Гэта значыць, альбо кіраўніцтва не спраўляецца са сваёй задачай, альбо хібы закладзены ў самой сістэме работы чыгункі і выправіць сітуацыю можа толькі яе рэфармаванне.

Агульнае ўражанне ад пачутага на калегіі: Беларуская чыгунка жыве някепска, большасць яе прадпрыемстваў маюць прыбытак, але шчасце гэта ненадзейнае, бо чыгунцы бракуе гаспадарлівасці. Напрыклад, аб'яднанню не ўдаецца спыніць дынаміку старэння асноўных сродкаў. На абнаўленне вагонаў, цеплавозаў, электравозаў кіраўніцтва бярэ банкаўскія крэдыты і пазыкі. За 2007 год сума пазык павялічылася на 67,5 млрд рублёў і дасягнула 286,5 млрд. Разам з тым, прыбытак практычна цалкам «праядаецца». Летась Мінская дыстанцыя пуцей Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі 95 працэнтаў свайго прыбытку выкарыстала на прэміі і ўзнагароджанне, а гэта больш за 1 млрд рублёў. Акрамя таго, апаратам кіравання Беларускай чыгункі не распрацоўваюцца каштарысы расходаў прыбытку, што дазваляе выкарыстоўваць яго бескантрольна.

«Аб'яднанне набыло на ўмовах фінансавай арэнды ў ТАА «Белінвестбанк» 700 грузавых вагонаў, — прывёў яшчэ адзін прыклад дрэннага распараджэння грашыма Беларускай чыгункай **начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за работай галін у сферы матэрыяльнай вытворчасці Камітэта дзяржкантролю Віталій ДЗЕРАХ.** — Кошт вагонаў у параўнанні з конкурснай цаной значна ўзрос з-за таго, што банк у разліках па здзелках выкарыстоўваў розныя валюты: расійскія рублі пры закупцы і долары пры перадачы вагонаў у лізінг. Гэта можа прывесці Беларускую чыгунку да дадатковых выдаткаў валюты ў памеры 1,4 млн долараў ЗША».

Не ў эканамічных інтарэсах галіны, праз двух пасрэднікаў, закуплены і калёсы цэльнакатаныя. Пры іх набыцці непасрэдна ў манапольнага прадаўца эканомія магла скласці 1,9 млрд рублёў.

Рэвізоры ўпэўніліся, што пры наяўнасці выбару Беларускай чыгунцы ўласціва спыняцца на тым, што даражэй. Так звычайна паступае той, хто альбо распараджаецца не ўласнымі грашыма, альбо не ўмее іх лічыць. Як вядома, тэндар на закупку тавараў аб'яўляецца для таго, каб выбраць той тавар, які найбольш адпавядае суадносінам цаны і якасці. Аднак унітарнае прадпрыемства «Белчыгунзаб» у ліпені 2007 года набыло для ўласных патрэбаў прафесійнае спартыўнае абсталяванне — самае дарагое з тых, што былі прапанаваныя. А для начальніка ваенізаванай аховы быў набыты аўтамабіль «Шкода» мадэлі «Супер-камфорт» коштам каля 24 тысяч еўра з падшклянкамі і нават футлярам для лыжаў. Пры тым, што цалкам магчыма было набыць больш танны аўтамабіль, напрыклад, «Ладу» за 7 тысяч еўра.

Пра некаторыя факты, якія сведчаць пра ўласную безгаспадарлівасць, кіраўнікі чыгункі са здзіўленнем даведаліся падчас калегіі дзяржкантролю. Напрыклад, на 92 прыборы дыстанцыйнага кіравання асвятленнем, на якія было выдаткавана 504 млн рублёў з інавацыйнага фонду, не была распрацавана праектная дакументацыя, і прыборы ляжалі без патрэбы на складзе, пакуль іх не знайшлі рэвізоры. Толькі пасля праверкі іх, нарэшце, усталявалі.

Дарэчы, дзякуючы дзяржкантролю былі знойдзены 140 з 868 спісаных вагонаў, якія лічыліся згубленымі. Праўда, толку ад знаходкі мала, бо вагоны ходзяць па чыгунцы іншых дзяржаў. Калі б гэтыя вагоны сапраўды былі спісаныя і здадзеныя на перапрацоўку, то Беларусь атрымала б 5,2 тыс. тон металалому. Праверка ўстанавіла, што дэфіцыт грузавых вагонаў пакрываецца пазыкай вагонаў у іншых краінах, а неправамернае спісанне іх прывяло да недахопу ў бюджэт падаткаў на суму 908,5 млн рублёў.

Са 145 рэфрыжэратарных вагонаў з няпоўнай загрузкай выкарыстоўваюцца толькі 13. У выніку за 2007 год агульная сума страт склала больш за 3 млрд рублёў. Разам з тым выкарыстоўваліся рэфрыжэратары з Латвіі, Украіны, Расіі і Літвы.

Беларуская чыгунка дазваляе сабе не толькі губляць вагоны сотнямі, але і памяшканні свае не выкарыстоўваць, альбо здаваць іх у арэнду прыватнікам па заніжаных стаўках. Ды і тыя грошы яна не бярэ своечасова. На пачатак года не былі задзейнічаны памяшканні агульнай плошчай каля 4,5 тыс. кв. метраў. Толькі Гомельскае аддзяленне Беларускай чыгункі з-за таннай арэнды ў 2006—2007 гадах недалічылася 5,2 тыс. еўра. Разам з тым за шэсць апошніх гадоў былі закрыты 63 магазіны і 72 сталовыя, якія раней працавалі ў сістэме чыгункі.

Чыгуначнікі не ўмеюць лічыць не толькі грошы. У Баранавіцкім аддзяленні рэвізоры выявілі 101 няўлічаны аб'ект. Аналагічная сітуацыя з інвентарызацыяй і на іншых аддзяленнях.

Рукі ў кіраўніцтва не даходзяць таксама і да новых будынкаў. Летась была спісана праектна-каштарысная дакументацыя па 13 аб'ектах, якія сёння сталі неактуальныя. Кошт гэтых распрацовак складае 800 млн рублёў. Па сутнасці, гэтыя грошы проста выкінутыя.

Цяжка сказаць, якую карысць прынеслі Беларускай чыгунцы і 286 тыс. долараў ЗША, выдаткаваныя на камандзіроўкі за 9 месяцаў 2007 года. За гэты час кіраўнікі выязджалі ў 33 краіны свету, аднак пра практычную карысць, якую паездкі прынеслі галіне, казаць цяжка. Напрыклад, начальнік службы тэхнічнай палітыкі знаходзіўся напрыканцы мінулага года тыдзень у Казахстане на пасяджэнні Савета па транспартнай палітыцы, пасля чаго прадставіў справаздачу з двух радкоў машынапіснага тэксту.

Абуральнай назваў **Старшыня Камітэта дзяржкантролю Зянон ЛОМАЦЬ** і практыку выдаткоўвання чыгункай сродкаў на будаўніцтва жылля сваім супрацоўнікам. Добра, што чыгунка дае льготныя крэдыты на будаўніцтва кватэр пад 3 працэнты. Гэта дае людзям больш магчымасцяў пабудаваць жыллё. Іншае пытанне, наколькі забяспечана вяртанне грошай пры звальненні работнікаў, і, увогуле, як гэта адлюстроўваецца на фінансавым становішчы галіны. Але самае галоўнае, незразумела, чаму некаторым начальнікам аказваецца пазыка ўвогуле беспрацэнтная, ды яшчэ і аплачваецца інфраструктура.

Кіраўніцтвам чыгункі ў 2006—2007 гадах ажыццёўлены не ўсе паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Летась з сямі паказчыкаў не выкананы тры, а з васьмі мэтавых паказчыкаў — два, у тым ліку па тэмпе росту платных паслуг і па тэмпе росту экспарту паслуг чыгуначнага транспарту.

— У цэлым па краіне праверана 70 арганізацый і падраздзяленняў Беларускай чыгункі, — падвёў вынік праведзенай дзяржкантролем работы Віталій Дзерах. — Парушэнні заканадаўства і недахопы знойдзены практычна ўсюды. Агульны памер штрафаў склаў 875,4 млн рублёў. Пастаўлена на бухгалтарскі ўлік гандлёва-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 2,2 млрд рублёў, дадаткова заплачана падаткаў у памеры 1,18 млрд рублёў.

Парушэнні абумоўлены, у тым ліку, недастаткова эфектыўным кантролем з боку Міністэрства транспарту і камунікацый. Неэфектыўна працуе таксама ведамасны кантроль.

— Невыкананне прагнозных паказчыкаў, няздольнасць выправіць сітуацыю са зносам асноўных сродкаў сведчаць пра глыбінныя хібы ў рабоце галіны, дзе знешне ўсё можа выглядаць больш-менш добра, — сказаў напрыканцы калегіі **міністр транспарту і камунікацый Уладзімір САСНОЎСКІ.** — Мы ўдзячныя Камітэту дзяржкантролю, які дапамог выявіць гэтыя хібы. Цяпер у Савет Міністраў унесены прапановы па рэфармаванні Беларускай чыгункі. Магчыма, гэта, а таксама глыбокі аналіз дзейнасці кіраўніцтва аб'яднання, дазволяць своечасова выправіць сітуацыю і пазбегнуць разбазарвання сродкаў у далейшым.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Калектыў Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці былога галоўнага спецыяліста Сакратарыята ЕРАМІНКА Уладзіміра Мікалаевіча і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже следующего имущества ОАО «Червенский молочный завод» (пл. зем. уч. 3,47 га), в том числе <u>здания и сооружения:</u> корпус завода (общ. пл. 2 431,4 кв.м), административное здание (общ. пл. 442,4 кв.м), склад казеина (общ. пл. 121,5 кв.м), мастерские (общ. пл. 269,2 кв.м), материальный склад (151,3 кв.м), склад (общ. пл. 172,8 кв.м), гаражи (общ. пл. 301,8 кв.м), мойка автомолочных цистерн и прачечная мойки спецодежды (159,9 кв.м), незавершенное строительство производственного цеха (общ. пл. 4 376 кв.м), резервуары подземные (2 ед.), подъезды и площадки, внешние сети трубопровода, внеплощадочные сети чугунные, теплицы, труба дымовая; <u>оборудование для производства кисломолочных изделий, транспортные средства</u> (автомобили ГАЗ 3110 Волга, УАЗ 3303, автопогрузчик дизельный вилочный, электропогрузчик вилочный), <u>мебель, оргтехника, компьютеры и др. имущество.</u> Начальная цена снижена на 50 % и составляет – 1 893 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2008 г. Аукцион состоится **26.09.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, (80293) 659569.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**

**4 сентября 2008 г. состоится внеочередное собрание акционеров ОАО «Камволь».**

*Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.*

**<u>ПОВЕСТКА ДНЯ:</u>**

***1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».***
***2. О внесении изменений в Устав Общества.***

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, комн. 204, тел.: 223 17 02, 3 15.

**Начало работы собрания в 15.00.**

**Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 сентября 2008 года.
Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, расположенных по адресу: г. Копыль, ул. Тимковичская, в том числе: здание цеха ЖБИ (общ. пл. 1181,7 кв.м) с мостовым краном КМ-5, компрессорная (общ. пл. 78,8 кв.м) и котельная (общ. пл. 82 кв.м). Начальная цена 377 463 579 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.04.2008 г. Аукцион состоится **11.09.2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Копыль, пл. Ленина, 6 (актовый зал). Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.09.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

## Парадак на ўчастку

# Зямельнае заканадаўства сур'ёзна парушаецца

**Ва ўсіх правераных рэгіёнах рэспублікі ўстаноўлены факты валакіты і парушэнняў дзеючага парадку з боку мясцовых выканаўчых камітэтаў і землеўпарадкавальных службаў пры афармленні дакументацыі аб прадастаўленні зямельных участкаў, а таксама выпадкі невыканання мясцовымі органамі ўлады патрабаванняў Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб адбіранні і прадастаўленні зямельных участкаў» у галіне размяшчэння ў адкрытым доступе інфармацыі аб свабодных зямельных участках.**

Факты вышэйзгаданых парушэнняў былі ўстаноўлены ў выніку праверкі Камітэта дзяржаўнага кантролю пры ўдзеле Генеральнай пракуратуры і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

У Гродзенскім раёне, напрыклад, выяўлены факты заніжэння кошту зямельных участкаў падчас перадачы іх у прыватную маёмасць грамадзян. Пры кадастравым кошце гэтых участкаў звыш 5 тысяч долараў грамадзяне плацілі за іх у адпаведнасці з рашэннем сельвыканкама каля 200 тысяч рублёў. У выніку бюджэт недаатрымаў больш за 11 мільёнаў рублёў.

Праверка правільнасці вылічэння, паўнаты і своечасовасці пералічэння землекарыстальнікамі плацяжоў за зямлю — зямельнага падатку і арэнднай платы — паказала, што ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі з-за невыканання указаных у нарматыўных прававых актах патрабаванняў па правядзенні дакументацыі на арандаваныя зямельныя ўчасткі, згодна з дзеючым заканадаўствам, адсутнасці належнага кантролю з боку мясцовых органаў улады дадзеныя плацяжы ў поўным аб'ёме не выплачваюцца.

Устаноўлены асобныя парушэнні патрабаванняў прыродаахоўнага заканадаўства. Так, у Брэсце выяўлены выпадкі засмечвання тэрыторый агульнага карыстання бытавымі адходамі. У месцах масавага адпачынку ў прыбярэжнай паласе ракі Мухавец толькі падчас правядзення праверкі мясцовымі органамі ўлады арганізавана санітарная чыстка прыбярэжнай паласы.

Усяго па выніках праверкі выяўлена каля 500 парушэнняў зямельнага і прыродаахоўнага заканадаўства, дапушчаных мясцовымі органамі ўлады. Устаноўлена таксама каля 150 парушэнняў зямельнага і прыродаахоўнага заканадаўства, дапушчаных карыстальнікамі зямель, большасць з якіх — гэта самавольная «акупацыя» зямельных участкаў і нямэтавае іх выкарыстанне.

Як паведамляюць у прэсслужбе Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, на 23 ліпеня ў мясцовыя бюджэты давыплачана каля 60 мільёнаў рублёў, звыш 60 юрыдычных і фізічных асобаў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці на агульную суму каля 90 мільёнаў рублёў, 7 службовых асобаў — да дысцыплінарнай адказнасці. У праваахоўныя органы накіраваны 5 матэрыялаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Кампетэнтна

# «КРЭДЫТ ДАВЕРУ» Ў 25 БАЛАЎ

**Праект закона аб увядзенні бальнай сістэмы, які ўжо абмяркоўваецца на аўтазапраўках, абедзенных перапынках і дома перад сном, ужо гатовы. Прапаноўваем перанесці прадмет дыскусіі на старонкі газеты «Звязда». Кожны з вас, паважаныя ўдзельнікі дарожнага руху, можа ўзяць удзел у абмеркаванні праекта, які яшчэ не ўступіў у сілу, унесці канструктыўныя прапановы, высветліць незразумелыя моманты. Магчыма, менавіта ваша меркаванне будзе ўлічана ў канчатковым варыянце праекта.**

**А зараз <u>начальнік ДАІ МУС Беларусі Аляксандр МЕНДЗЕЛЕЎ</u> знаёміць з асаблівасцямі папярэдняга варыянта праекта.**

— Плануецца, што вадзіцелі будуць атрымліваць разам з вадзіцельскім пасведчаннем «крэдыт даверу» ад службы Дзяржаўтаінспекцыі — 25 балаў. І кожны сам мае права вырашаць, як распарадзіцца сваім «авансам». Калі на працягу года 25-бальны ліміт будзе вычарпаны, то вадзіцель аўтаматычна пазбаўляецца вадзіцельскага пасведчання на год. Год без парушэнняў (адлік пачынаецца з апошняга парушэння) — і 25 балаў вяртаюцца.

***— Аляксандр Міхайлавіч, навошта патрэбна (і ці патрэбна) уводзіць бальную сістэму ацэнкі парушэнняў ПДР для вадзіцеляў?***

— Гэта сусветная практыка, якая неаднаразова сябе апраўдала. З увядзеннем бальнай сістэмы ў іншых краінах прыкметна зніжалася колькасць парушэнняў правілаў дарожнага руху. Прывяду прыклад. У Францыі ў 1991 годзе ўпершыню ўвялі бальную сістэму, тым самым адразу ж скарацілі колькасць загінулых на 541 чалавека! Згадзіцеся, сур'ёзная лічба. Мы перакананыя, што вяртанне да сістэмы ўліку правапарушэнняў накшталт савецкай (памятаеце, правоў пазбаўлялі за тры «праколы» на спецыяльным талоне папярэджання) значна палепшыць аварыйную сітуацыю і на беларускіх дарогах.

***— Калі бальная мера выхавання вадзіцеляў уступіць у сілу?***

— Дакладна сказаць не магу. Зараз яна знаходзіцца на стадыі абмеркавання. Але, думаю, канчатковае рашэнне наконт праекта Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прававога рэгулявання адміністрацыйнай адказнасці» будзе прынятае на восеньскай сесіі дэпутатаў.

***— «Напрыклад, у мяне 27 мая спаўняецца год з таго моманту, як я быў аштрафаваны за перавышэнне хуткасці. Калі я не растрачу свае 18 балаў за 364 дні, то як я буду ездзіць 365 дзень, ведаючы, што балы «згараць» і эканоміць іх няма сэнсу?»— мадэлюе сітуацыі наведвальнік форуму ў інтэрнэце.***

— Безумоўна, незрасходаваныя балы накапліваца не будуць. Але я не рэкамендаваў бы сваволнічаць, тым больш у апошні дзень, бо, як толькі вы парушыце ПДР, адразу ж можаце адлічваць новы год, каб вярнуць свае 25 балаў.

***— Зараз за паўторнае перавышэнне хуткасці забіраюць правы, а па новай сістэме будуць знімаць толькі 10 балаў?***

— Тут разглядаюцца два варыянты. Першы — прапаноўваецца пазбаўляць вадзіцельскага пасведчання толькі ў тым выпадку, калі вадзіцель вычарпаў 25-бальны ліміт. Другі — за стварэнне аварыйнай сітуацыі на дарозе, уцёкі з месца здарэння, кіраванне ў стане алкагольнага ап'янення і паўторнае перавышэнне хуткасці вадзіцель пазбаўляецца права на кіраванне незалежна ад колькасці растрачаных да гэтага балаў. Акрамя таго, папярэджваю чарговае пытанне, штрафы нікуды не дзенуцца — парушальнікі будуць плаціць за свае памылкі так, як плацяць і цяпер. Адным словам, дзеючае заканадаўства застаецца ў сіле. Толькі вось, магчыма, мэтазгодна паменшыць мінімальны тэрмін пазбаўлення правоў да месяца (на сёння ён складае да 6 месяцаў).

***— Усім вадзіцелям плануецца даваць аднолькавую колькасць балаў незалежна ад стажу?***

— Пакуль так. Але маладому вадзіцелю трэба даваць, на мой погляд, менш балаў, чым вадзіцелю са стажам. Так, прынамсі, робіцца ў многіх краінах: вадзіцелю, які за рулём больш за два гады, даюць, напрыклад, 18 балаў, навічкі ж атрымліваюць на 4 балы менш. Мала таго, за мяжой трэба здаваць на правы двойчы. Другі раз — пасля таго, як малады вадзіцель прайшоў праверку часам: на практыцы даказаў, што здольны кіраваць аўтамабілем.

***— З якіх меркаванняў зыходзілі распрацоўшчыкі праекта пры суаднясенні колькасці штрафных балаў з правапарушэннямі?***

— Адназначна, са ступені грамадскай небяспекі здзейсненых вадзіцелямі парушэнняў. Напрыклад, перавышэнне хуткасці і кіраванне транспартным сродкам, не прышпіліўшыся рэменем бяспекі — нераўназначныя парушэнні. Таму, чым сур'ёзнейшае парушэнне, тым больш будзе здымацца штрафных балаў.

***— І, нарэшце, за якія парушэнні здымаюцца балы? І колькі балаў адпавядае кожнаму з гэтых парушэнняў?***

**1) Калі транспартны сродак мае сапсаваную тармазную сістэму, рулявое кіраванне, счэпнае ўстройства (у саставе цягніка), шклоачышчальнікі (у час выпадзення ападкаў), фары і заднія габарытныя агні (ва ўмовах недастатковай бачнасці), а таксама, калі машына пераабсталявана без згоды ДАІ ці неабсталяваная, як патрабуюць тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, то ў вадзіцеля здымаюцца 4 балы.**

**Калі аўтамабіль мае іншыя няспраўнасці ці шафёр парушае ўмовы, пры наяўнасці якіх ПДР забараняюць яго ўдзел у дарожным руху, то яго «скарбонка» вадзіцеля «пахудзее» на 2 балы.**

**2) За парушэнне хуткаснага рэжыму здымаецца ад 2 да 10 балаў: розніца паміж паказаннямі радара і ўсталяванай правіламі дарожнага руху хуткасцю не перавышае 21 км/г — 2 балы, перавышэнне ўсталяванай хуткасці ад 20 да 30 км/г — 5 балаў, на 30 км/г і больш — 7 балаў, паўторнае перавышэнне хуткасці на працягу года — 10 балаў з пазбаўленнем права кіравання на тэрмін да 6 месяцаў.**

**3) За кіраванне транспартным сродкам вадзіцелем, які сам ці яго пасажыры не прышпілены рэменем бяспекі, таксама кіраванне матацыклам ці перавозку на ім пасажыраў без моташлемаў ці з незашпіленымі шлемамі — 2 балы.**

**4) Ігнараванне патрабаванняў сігналаў святлафора і ўказанняў рэгуліроўшчыка — 10 балаў.**

**5) Пакаранне ў 10 балаў з пазбаўленнем права кіравання на тэрмін да 6 месяцаў чакае і вадзіцеляў, якія не прапусцяць машыну хуткай дапамогі, міліцыі, пажарную машыну.**

**6) Парушэнне правілаў манеўравання, абгону ці выезд на сустрэчную паласу ў забароненым месцы — 7 балаў.**

**7) Парушэнне ж правілаў праезду перакрыжаванняў, пешаходных пераходаў і прыпынкаў маршрутнага транспарту выльецца вадзіцелю ў 6 балаў.**

**8) Ігнараванне дарожных знакаў ці разметкі (за выключэннем выезду на паласу сустрэчнага руху) ці парушэнне правілаў размяшчэння транспартных сродкаў на дарозе, а таксама непрадастаўленне пераваг у руху маршрутнаму транспарту, пешаходам — скароціць запасы балаў на 5 адзінак.**

**9) Парушэнне правілаў руху па аўтамагістралі, перавозкі пасажыраў, злоўжыванне гукавымі сігналамі і светлавымі прыборамі, парушэнне правілаў прымянення аварыйнай сігналізацыі і знака аварыйнага прыпынку — 4 балы.**

**10) Парушыў правілы руху ў жылой зоне альбо правілы перавозкі грузаў — «заплаці» яшчэ 2 балы.**

**11) Калі парушэнні, апісаныя пунктамі 4—10, сталі прычынай стварэння аварыйнай сітуацыі, вадзіцель пазбавіцца не толькі 10 балаў, але і правоў на тэрмін да 6 месяцаў.**

**12) Калі вадзіцель размаўляў у час руху па мабільным тэлефоне ці партатыўнай рацыі, то пазбаўляецца 1 бала.**

**13) Парушыў правілы праезду чыгуначнага пераезда — 5 балаў, паўторна на працягу года — 7 балаў.**

**14) Парушэнне ПДР, якія мелі наступствам прычыненне пацярпеламу лёгкага цялеснага пашкоджання ці пашкоджання транспартнага сродку, грузу, дарожнага пакрыцця ці іншай маёмасці — адымаецца ад 7 да 12 балаў з пазбаўленнем права кіравання на тэрмін да 6 месяцаў.**

**15) Невыкананне вадзіцелем патрабаванняў работніка міліцыі аб спыненні транспартнага сродку — 5 балаў, неаднаразовых патрабаванняў аб спыненні машыны — 10 балаў.**

А што з гэтай нагоды думаеце вы?

**Надзея ДРЫЛА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ВАДЗІЦЕЛЬСКІ ТАЛОН З... ЧЭРКІЗАЎСКАГА РЫНКУ

Падчас чарговага рэйду па выяўленні вадзіцеляў маршрутных транспартных сродкаў дзяржаўтаінспектар ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска спыніў вадзіцеля за «перагруз». Супрацоўнік склаў пратакол, але пры рэгістрацыі матэрыялу аўтэнтычнасць талона да вадзіцельскага пасведчання выклікала сумненне. Дата выдачы дакументаў не супадала. Пры праверцы было выяўлена, што і нумар талона, які прад'явіў затрыманы, не той. Парушальнік патлумачыў, што страціў свой талон на тэрыторыі Расіі і вырашыў набыць новы, аднак не так, як таго патрабуе закон... «Я вырашыў зэканоміць: купіў яго за 300 расійскіх рублёў (каля 27 тысяч беларускіх) на Чаркізаўскім рынку. Паведаміў гандляру свае даныя, не прайшло і трох гадзін — трымаў у руках новы талон, які з выгляду нічым не адрозніваўся ад сапраўднага». Пры дэталёвым даследаванні сумненне пацвердзілася: бланк талона сапраўды выраблены не на прадпрыемстве, якое ажыццяўляе выпуск дакументаў дадзенага віду, — адзначыла старшы інспектар агітацыі і прапаганды ДАІ РУУС горада Мінска, капітан міліцыі Вольга Суворава. — Згодна з артыкулам 380 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Падробка, выраб, выкарыстанне ці збыт фальшывых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў», за такое злачынства прадугледжана максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да 3 гадоў.

**Надзея ДРЫЛА.**


## ИНВЕСТИЦИОННОЕ ПРЕДЛОЖЕНИЕ

### общество с ограниченной ответственностью «Завод «Вейнянский родник»

**<u>Основной вид деятельности:</u>** Производство безалкогольных газированных напитков на сахаре и подсластителе, слабоалкогольных газированных напитков, минеральных и питьевых вод.

**<u>Расположено по адресу:</u>** Республика Беларусь, Могилевская область, Могилевский район, поселок Вейно.

**<u>Учредители:</u>** ОАО «Могилевхимволокно», доля уставного фонда составляет 66,22 %, и УКАП «Фирма «Вейно» (предприятие районной коммунальной собственности), доля 33,78 %.

**<u>Способ продажи:</u>** Продажа (долей) предприятия как имущественного комплекса. (При наличии инвестиционного проекта возможна адресная продажа.) Возможно техническое перевооружение и модернизация производства.

**<u>Условия:</u>** Сохранение рабочих мест и социальных гарантий работников предприятия не менее 5 лет. Наращивание объемов производства промышленной продукции и потребительских товаров (в стоимостном выражении) и увеличение экспортных поставок в рамках доведенных прогнозных показателей. Соответствие продукции международным стандартам качества.

**<u>Реквизиты предприятия:</u>** Республика Беларусь, Могилевская область, Могилевский район, поселок Вейно. Тел.: (8 0222) 202 867, 202 028, 202 318. E-mail: vrodnik@tut.by

***Предложения инвесторов принимаются и рассматриваются на ООО «Завод «Вейнянский родник», тел.: (8 0222) 202 867, 202 028, 202 318 (директор Кучеров Петр Иванович) и в Могилевском районном исполнительном комитете: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 63 а, тел.: (8 0222) 22 22 61, 25 29 83, 22 51 21 (Заместитель председателя райисполкома по экономике Седуков Андрей Николаевич).***

## КРАТКОЕ ОПИСАНИЕ ПРЕДПРИЯТИЯ

Предприятие ООО «Завод «Вейнянский родник» основано 24 марта 1993 года, введено в эксплуатацию в 1994 году. Учредителями предприятия являются: ОАО «Могилевхимволокно» — 66,33 процента доли в уставном фонде предприятия, УКАП «Фирма «Вейно» — 33,78 процента.

Предприятие занимает площадь в 4 тыс. м кв.

Технологический процесс и оборудование закуплено и скомплектовано фирмой «KRUPP CORPOPLAST» (Германия), в состав которого входит: установка для выдува бутылок из ПЭТФ — преформ, машина для розлива и укупорки, этикетировочная машина, оборудование установки водоподготовки, оборудование приготовления купажных сиропов.

Производственная мощность составляет 3800 бутылок в час.

В 2005 году установлена дополнительно вторая линия разлива в ПЭТ-тару объемом 2,0 л, 1,5 л, 1,0 л и 0,5 л, производительностью 800—1000 бутылок в час. Оборудование поставлено фирмой ООО «Ай Си Импекс» г. Минск и состоит из компрессоров, выдувных машин, транспортеров, ополаскивателя, сатуратора, разливочной машины, укупорочного агрегата, этикетировочной и упаковочной машины. Кроме того, установлено дополнительное оборудование: отделение водоподготовки, холодильное, теплообменное и насосное оборудование, отделение приготовления купажных сиропов.

Данная линия позволяет увеличить объем производства продукции до 28 млн бутылок в год и расширить ассортимент за счет различного вида упаковки.

В 2006 году введена в эксплуатацию производственная линия по разливу питьевой воды в ПЭТ-бутылки вместимостью 5,0 л производительностью 100 бутылок в час.

Имеется спиртохранилище для хранения 1000 дал спирта этилового ректификованного и отделение приготовления вводно-спиртового 20 % раствора.

С момента пуска завода ассортимент продукции с трех наименований возрос до 200, в том числе освоен выпуск минеральной воды, слабоалкогольных и сокосодержащих напитков. Годовой выпуск увеличился с 19,2 до 25,4 млн бутылок.

Расположенный недалеко от предприятия источник минеральной воды (Санаторий «Сосны» ОАО «Могилевхимволокно») позволяет выпускать лечебно-столовую минеральную воду «Сосны-1» и столовую минеральную воду «Сосны-2», которые отмечены серебряной и бронзовой медалями на престижных международных дегустациях в рамках Международных выставок в Москве, Санкт-Петербурге, Минске.

В мае 2008 года предприятие награждено дипломом Международной академии «Качества и маркетинга», стало лауреатом 12-го конкурса и награждено золотой медалью.

УНП 700130261


### НОВЫЯ ДАПАМОЖНЫЯ СРОДКІ — У СВАІМ КАНСТРУКТАРСКІМ БЮРО

**У наступныя два гады плануецца рэалізаваць некалькі буйных інвестыцыйных праектаў па ўстановах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.**

У прыватнасці, як паведаміла карэспандэнту «Звязды» начальнік упраўлення стацыянарных устаноў, інвестыцый і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марыя Гарбацэвіч, гаворка ідзе аб пашырэнні санаторыяў «Ясельда» і «Белая Вежа», рэканструкцыі лячэбных карпусоў у санаторыях «Вяжуці», «Бярэзіна» і ў Рэспубліканскім інтэрнаце для ветэранаў вайны і працы, а таксама аб стварэнні корпуса сацыяльнай рэабілітацыі і спецыяльнага канструктарскага бюро ў Беларускім пратэзна-артапедычным аднаўленчым цэнтры.

Не менш важным напрамкам застаецца зніжэнне выдаткаў на ўтрыманне ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання. Паводле слоў Марыі Гарбацэвіч, бліжэйшым часам працягнецца ўкладанне сродкаў у энергазберажэнне. Скажам, да канца 2011 года ёсць намер цалкам перавесці кацельні сацыяльных устаноў на мясцовыя віды паліва і газ, што дазволіць адмовіцца ад ацяплення найбольш дарагім мазутам.

**Сяргей ГРЫБ.**


*Віншуем з юбілеем паважанага **Мечыслава Віктаравіча МОРХАТА**. Жадаем шчасця і здароўя і каб на ўсё хапала сіл.*

**Родныя, сябры,** *в. Залесінкі.*

У дзень 20-годдзя жадаем **Аляксандру ЛАНКЕВІЧУ** з Барысава моцнага здароўя, верных сяброў, поспехаў і ўдачы ў жыцці.

**Родныя са Стоўбцаў.**

*Паважаны **Васіль Міхайлавіч АЧАПОЎСКІ,** наш былы вучань, дырэктар саўгаса «Слуцк», віншуем цябе з юбілеем. Жадаем здароўя, творчых поспехаў, энергіі, шчырасці і дабрыні да людзей.*

**Былыя настаўнікі Новікі.**


## Дабрачыннасць

# Паважаныя грамадзяне!

*Да вас звяртаецца Торчык Мальвіна Пятроўна, маці 13-гадовага хлопчыка Вячаслава Уладзіміравіча Торчыка. У нас вялікая бяда, хлопчык не бачыць з нараджэння, але ў Ленінградскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы (куды мы звярталіся па дапамогу) абяцалі нам дапамагчы. Лячэнне платнае. Мы жывём у вёсцы, і такіх грошай у нас няма.*

Вялікая просьба — дапамажыце нам! Нам адкрылі дабрачынны рахунак у філіяле **№ 626 ААТ «АСБ Беларусбанк» г. Мар'іна Горка, УНН 600196859, код 153001123, разліковы рахунак № 3819382101398, дабрачынны рахунак № 000000004 на імя Торчык Мальвіны Пятроўны на лячэнне Торчыка Вячаслава Уладзіміравіча.**

**Дзякуй вам за дапамогу, добрыя людзі. Наш хатні тэлефон: 8 01713 70 704.**


Шукаю сяброў-аднадумцаў — аматараў беларускай культуры, мастацтва, гісторыі, этнаграфіі, фальклору.

**Аляксандр Рунец.**

**Тэл.: 8 029 980 92 69.**


**У суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ПАДАБЕДА Пятра Андрэевіча,** 22 жніўня 1962 года нараджэння, ураджэнца горада Касцюковічы Магілёўскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання ў 1993 годзе — горад Касцюковічы. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна П.А. Падабеда, паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Лідскага раёна Гродзенскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **АНДРЫЯНАВА Сяргея Кімавіча**, 1961 года нараджэння (лістапад), ураджэнца горада Улан-Удэ, Бурацыя, які пражываў да 1994 года і прапісаны да цяперашняга часу ў горадзе Ліда па вул. Стралкоўскага, 17-а. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якім штосьці вядома пра С.К. Андрыянава, паведаміць іх суду Лідскага раёна па тэлефонах: 25 239 або 24 441 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

## Простыя рэчы




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЯМІДЗЕСЯТЫЯ гады. У Браславе праходзіць семінар творчай моладзі. Сабраліся маладыя і ўжо не зусім літаратары, мастакі, акцёры, музыканты, кінематаграфісты... Прыехалі мэтры. Як правіла, на такіх семінарах не абыходзілася вечарамі без чаркі і добрай чаркі. Кіраўніцтвам гэта не тое што заахвочвалася, але і не каралася. І вось засядзеліся ўначы доўга. А раніцою аднаму акцёру трэба ехаць у Віцебск. У яго адказны спектакль. Аўтобус з Браслава выходзіць рана, да таго ж ад нашага начлегу да аўтастанцыі пару кіламетраў. А падняць акцёра не можам ніяк. За шэсць гадзін у аўтобусе ён праспіцца. Толькі як даставіць да аўтобуса? І тут нехта вынаходлівы ўспамінае, што бачыў ля качагаркі турбазы тачку. Давай!

Вытралёўваем небараку з пакоя на двор, падганяем тачку, грузім. І ўсёй маладой кампаніяй кіруем на аўтастанцыю. Смех, жарты. Маладыя былі, у галовах — вецер. Але акцёр даехаў да Віцебска, спектакль адбыўся. Трыццаць гадоў назад гэта было...

Тачку, дарэчы, мы вярнулі на месца. Не так, як у тым анекдоце пра тачку. На прахадной начальнік аховы спрабуе злавіць патэнцыйнага злодзея, які вывозіць з тэрыторыі завода тачкі са смеццем. Кожны раз, як той зламыснік з'яўляецца на прахадной, начальнік сам, уласнаручна перапорвае ўсё смецце, якое вывозіцца. Сапраўды смецце, каштоўнага нічога няма. Так паўтараецца не адзін і нават не дзесяць разоў. У рэшце рэшт начальнік аховы ў роспачы звяртаецца да рабочага:

— Ведаю, што ты нешта крадзеш, але не магу зразумець, што. Прызнайся. Табе нічога не будзе. Дык што ты крадзеш?

— Тачкі.

Энцыклапедычныя слоўнікі падаюць, што **тачка** — ручная каляска на адным коле, якую возяць, трымаючы за ручкі і штурхаючы перад сабой. Дарэчы, у старой беларускай мове тачцы адпавядала — **турляжка** (турляць — пхнуць перад сабой). Гэта крыху састарэла. Бо тачкі ёсць і на двух колах, і на чатырох. І вельмі часта іх цягаюць за сабою. Але класічная тачка менавіта такая — адно жалезнае кола, жалезны альбо ў лепшым выпадку драўляны кузаў і дзве ручкі, за якія трымаецца чалавек.

Прашу садоўнікаў і агароднікаў спыніць параўнанні. Вашы сённяшнія тачкі лёгкія, на гумавым ходу. На іх вы, вядома, часам і гной, і грунт перавозіце, у іх ураджай са сваіх участкаў забіраеце. Цяжкавата, але не так, як было раней. Тачка ў класічным яе выглядзе — зусім не для садовых і агародніцкіх забаў. Тачка ўзнікла для таго, каб крыху аблегчыць працу чалавека, аднаго чалавека, па перамяшчэнні цяжкіх грузаў.

Узнікла яна, зразумела, адразу пасля ўзнікнення кола — аднаго з найважнейшых вынаходніцтваў чалавецтва. А пасаджаная на кола пляцоўка, думаю, выкарыстоўвалася і тысячагоддзі назад, калі чалавеку трэба было перамяшчаць грузы. І ў час пабудовы егіпецкіх пірамід тачкі ўжо былі неабходнымі, самымі прымітыўнымі машынамі.

Але ж тачкі існавалі, існуюць, будуць існаваць і надалей. Мадыфікаваныя, зручныя, але вельмі патрэбныя людзям у невялікай іх гаспадарцы. У пэўныя перыяды тачка — сімвал стваральнай працы. Успомніце кінахронікі нашай былой радзімы СССР дваццатых — трыццатых гадоў. Будаўніцтва Днепрагэса, Беламорска-Балтыйскага канала, іншых буйных аб'ектаў таго часу. Асноўныя прылады працы — рыдлёўка, насілкі і... тачка. Так, тачка. Для яе ствараліся спецыяльныя насцілы, каб вывозіць грунт з катлаванаў. Нормы выпрацоўкі даводзіліся па тачках. Угледзьцеся ў твары людзей, якія патрапілі ў тагачасную кінахроніку: яны нібыта і вясёлыя, але... пры тачках. А што большасць з іх пры гэтым лічылася зняволенымі, пазбаўленымі ў правах, прымусова абавязанымі для гэтых работ — заставалася па-за кадрам.

І яшчэ мне ўспомнілася з гісторыі Расійскай імперыі. Здаецца, дзекабрыстаў у Нерчынскіх рудніках ці не прыкоўвалі да гэтых самых тачак. Бо ў тыя часы руду альбо вугаль з шахты можна было вывезці толькі на тачцы. Прыкаваць да тачкі. Мая памяць нейкая выбіральная. Чытаў і чытаю шмат. А вось калі саджуся пісаць, усплывае нешта толькі самае яркае альбо тое, што ўразіла сваёй недарэчнасцю.

Успомніў. Быў у СССР такі пісьменнік Валянцін Пікуль. Дарэчы, не вельмі прыхільна ставіўся да нас, беларусаў, да нашай гісторыі. Але тут возьмем іншае. Ёсць у яго раман «Катарга» пра Сахалін. Дзеянне рамана — гэта час руска-японскай вайны і перадваення. Гэта самы пачатак дваццатага стагоддзя. Японскія разведчыкі пад выглядам дыпламатаў і журналістаў звяртаюцца да губернатара Сахаліна з просьбай даць ім магчымасць паздымаць краявіды, людзей. Ды працытую, знайшоў:

— Желательно бы представить известных рецидивистов, прикованных к тачкам, — это так экзотично!

Лепишев (губернатар — **А.К.**) задумался. Раньше, когда здесь еще была Сонька Золотая Ручка, местные власти здорово наживались на продаже фотооткрыток, изображающих сцены заковывания в кандалы. Эти снимки были тогда популярны в России.

— Я распоряжусь, — сказал губернатор консулу, — чтобы заковали в кандалы старых уголовников, они будут позировать вместе с тачками. Экзотика пусть остается экзотикой!»

Тут трэба патлумачыць, што тады, у пачатку мінулага стагоддзя, Сахалін пастаўляў Расіі не толькі лес, рыбу, але і каменны вугаль. На каменнавугальных шахтах працавалі ў асноўным і пераважна зняволеныя, бо Сахалін быў востравам-катаргай для крымінальных і палітычных злачынцаў. Вугаль па якасці быў цудоўны, але якасці паставак не давалі прыкаваныя да тачак зняволеныя. Ім абы норму адкалоць і вывезці — а якая там якасць, іх не датычыла. Думаю, што з тых, калі не ранейшых, часоў увайшло ў мову паднявольных рабацяг, калі адказвалі яны начальству:

— Перакурым, тачкі змажам.

Гэты выраз існуе і сёння, асабліва ў асяроддзі грузчыкаў маленькіх баз, пераваладчных пунктаў, дзе выкарыстоўваюцца не электракары, а яшчэ самыя звычайныя тачкі, на якіх перавозяцца тавары з аднаго склада ў другі, альбо са склада ў які цэх, альбо са склада ў краму.

Адно з удасканаленняў тачкі — ваганетка. Ваганетка — большая ёмістасць альбо платформа, прыстасаваная для перавозкі грузаў па вузкакалейных ці падвясных дарогах. Яны выкарыстоўваліся і на лесапераапрацоўцы, і на іншых работах, але найбольш у шахтах. Ваганетка вельмі цяжкая рэч, у нагружаным выглядзе аднаму чалавеку яе і не скрануць. Патрабуецца некалькі рабочых рук. Калі ж у шахце некалькі такіх ваганетак з вугалем — тут патрэбна ўжо і конская сіла. А для паганяння каня і канагон. Вось-вось, зноў успамін і якраз пра канагона.

У рэдакцыю часопіса «Маладосць» я ўпершыню патрапіў яшчэ ў салдацкіх пагонах, на другім годзе службы. Папярэдне паслаў туды вершы. А аднойчы скарыстаў звальненне ў Мінск, адважыўся зайсці ў рэдакцыю. Зразумела, адправілі мяне да загадчыка аддзела паэзіі Мікалая Якаўлевіча Аўрамчыка. І тут аказалася, што некалькі маіх вершаў падрыхтавана да друку. Патрэбен толькі фотаздымак.

— Ёсць пры сабе?

Пры сабе аказаўся толькі вайсковы, у пілотцы. Такі і надрукавалі.

Прызнаюся, толькі потым учытаўся ў кнігі самога Міколы Аўрамчыка. А сярод іх была і такая — «Сустрэча былых канагонаў». Гэта сёння нам лёгка гаварыць пра мінулыя ваенныя нягоды. А Мікалай Якаўлевіч глынуў іх нагбом. Франтавік, які трапіў у палон у 1942-м. Хапіла яму пасля вайны тагачаснай паметкі ў анкеце аб гэтым палоне. А ў палоне патрапіў паэт на каменнавугальныя шахты Рура. І працаваў там... канагонам. І пра гэта — у вершы:

*Ты ж канагон,*
*як кажуць,*
*па прызванні,*
*А я, брат,*
*паняволі канагон...*
*Заплюшчу вочы —*
*ўсё як ёсць дазвання*
*Прыгадваю,*
*нібы жахлівы сон.*
*Паўзмрочная капальня*
*ў дымным Руры,*
*І ў ёй не я,*
*а сноўдае штодзень*
*Шкілет,*
*які яшчэ абцягнут скурай,*
*Ды на сцяне —*
*чужы сутулы цень.*

У гэтым вершы паэт звяртаецца да сябра па зняволенні, які і да палону быў канагонам у Данбасе. Але і самому паэту пасля вайны давялося шмат папрацаваць у тым Данбасе, пакуль змог ён вярнуцца на Радзіму.

Так складвалася жыццё, што маё пакаленне правінцыялаў проста не магло не працаваць на зямлі ад маленства, дапамагаючы бацькам, а потым і наладжваючы свае стасункі з ёю. Быў у мяне перыяд, калі даводзілася думаць пра апрацоўку некалькіх дзесяткаў сотак, а потым і пары гектараў, потым зноў некалькіх дзесяткаў сотак. І заўсёды цяжка было абысціся без звычайнай тачкі. Сёння яна ў гаспадарцы патрэбна асабліва ў асеннюю пару — вывезці з участкаў тое каліўе і пустазелле, якое зямлі не патрэбна зімою, развезці па ўчастках гной, калі ён ёсць, — вельмі патрэбны зямлі пад будучы ўраджай. Але тачка патрэбна, як і многім, многім іншым.

Разумею, што для маладых беларусаў слова тачка гучыць у зусім іншым сэнсе. «Тачкамі» яны называюць аўтамабілі і найперш замежных марак, бо «масквіч» ці «жыгулі» пад гэта вызначэнне неяк і не падпадаюць. «Крутая тачка» — вось адзін з фактараў таго, што чалавека можна назваць паспяховым. Пярэчанняў тут і быць не можа. Чалавек у гэтым свеце павінен быць паспяховым. Павінен дабівацца вельмі многага (праўда, калі гэта заваёвана ўласным розумам, ініцыятывай, працай, ды ў рэшце рэшт і ўмелымі рукамі, але не звязана з нечым крымінальным). Нашы дзеці ідуць далей за нас, а ўнукі пойдуць яшчэ далей. Проста, магчыма, і не трэба ім забывацца на такую простую і звычайную рэч, як тачка, на адным, ці двух, ці больш колах.

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

*Віцебская вобласць.*

### НАЕХАЎ НА МАЛЕНЬКАГА СЫНА

**26-гадовы вадзіцель «Пежо» пры руху прыватнага аўтамабіля заднім ходам наехаў на 2-гадовага сына.**

Адбылося гэта раніцай у двары дома, дзе яны жывуць, у Міёрскім раёне. Хлопчык шпіталізаваны ў рэанімацыйнае аддзяленне раённай бальніцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### П'ЯНКА — БОЙКА — ТУРМА

**Двое маладых хлопцаў так напіліся ў брэсцкім бары па вуліцы Валадарскага, што пачалі без дай прычыны чапляцца да ўзброенага міліцыянера з Дэпартамента аховы.**

Завязалася бойка, хуліганы пабілі служывага чалавека, а потым спрабавалі адабраць у яго зброю. Міліцыянер здолеў выклікаць падмогу, і дэбашыраў затрымалі. Суд даў кожнаму па пяць з паловай гадоў пазбаўлення волі. Цяпер будзе час абдумаць свае ўчынкі і падзякаваць лёс за тое, што супрацоўнік міліцыі не прымяніў табельную зброю для самаабароны... А лепшыя гады пройдуць за кратамі.

**Яна СВЕТАВА.**

### ЗАТРЫМАНЫ ГАНДЛЯРЫ «ЗЕЛЛЯ»

**У Полацку 22-гадовы беспрацоўны прапанаваў набыць другому беспрацоўнаму 60 таблетак экстазі. Пры гэтым падмануў яго, і як кажуць, махлярскім шляхам завалодаў 400 доларамі ЗША. У дачыненні да гандляра экстазі ўзбуджана крымінальная справа.**

А ў Віцебску прама на вуліцы міліцыянеры пад вечар затрымалі раней судзімага грамадзяніна, пры якім было больш як 1,2 кілаграма наркотыку — макавай саломкі. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### У АЛУШЦЕ МЯСА ВЫМОЧВАЛІ Ў ФАРМАЛІНЕ

**Паводле інфармацыі аднаго з расійскіх сайтаў, мяса для гатавання шаурмы ў Крыме вымочваюць у фармаліне, які папярэджвае разлажэнне.**

Такі падпольны цэх выяўлены ў Алушце. Мяса пастаўлялася ў дзесяткі гандлёвых пунктаў па вытворчасці і продажу шаурмы. Як паведамляецца, у Алушце ёсць толькі тры зарэгістраваныя пункты па продажы шаурмы, усе астатнія працуюць нелегальна. Паведамляецца і аб фактах атручэння не толькі мясам, у прыватнасці, шаурмой, але і іншымі харчовымі прадуктамі.

**Ул.інф.**

